NACIONALINIS EGZAMINŲ CENTRAS

2015

______________________________________________

(miestas / rajonas, mokykla)

_________ klasės mokinio (-ės) ______________________________

(vardas ir pavardė)

# GIMTOJI KALBA (BALTARUSIŲ)

2015 m. mokyklinio brandos egzamino užduotis

Pagrindinė sesija

**2015 m. gegužės 28 d.** **Trukmė – 4 val. (240 min.)**

## NURODYMAI

- Pasitikrinkite, ar egzamino užduočių sąsiuvinyje nėra tuščių lapų ar kito aiškiai matomo spausdinimo broko. Pastebėję praneškite egzamino vykdytojui.
- Antraštiniame lape užrašykite savo vardą ir pavardę, rajoną / miestą, mokyklą ir klasę (grupę).
- Vertinami tik tie atsakymai, kurie parašyti mėlynai rašančiu rašikliu. Koregavimo priemonėmis naudotis negalima. Neaiškiai parašyti, pribraukyti atsakymai vertinami 0 taškų.
- Atlikdami teksto suvokimo užduotis (II egzamino dalis), į klausimus atsakykite glaustai ir aiškiai. Jūsų atsakymai turi tilpti paliktose eilutėse.
- III egzamino dalyje pateiktos trys rašinio temos ir du tekstai interpretacijai. Įdėmiai juos perskaitykite, pasirinkite ir parašykite vieną rašinį arba vieną teksto interpretaciją.
- Turite parašyti 250–400 žodžių (A4 formato 1–2 puslapiai) tekstą. Vertinant bus atsižvelgiama ir į darbo apimtį. Švarraštyje suskaičiuokite žodžius. Paraštėje **nurodykite 250 žodžių ribą**.
- Jeigu pirmiausia rašote juodraštyje, pasilikite pakankamai laiko darbui perrašyti į švarraštį. **Juodraštis nebus tikrinamas.**
-

Linkime sėkmės!

**EGZAMINO VERTINIMAS TAŠKAIS**

| **II dalis (teksto suvokimas)** | **III dalis (rašinys arba interpretacija)** | **TAŠKŲ SUMA** |
|---|---|---|
| 30 taškų | 40 taškų | 70 taškų |
| | | |

Vertinimo komisija: ______________________

(parašas, vardas ir pavardė)

______________________

(parašas, vardas ir pavardė)

______________________

(parašas, vardas ir pavardė)

© Nacionalinis egzaminų centras, 2015

# II egzamino dalis

# TEKSTO SUVOKIMAS

**Прачытайце тэкст і выканайце змешчаныя пасля яго заданні.**

**I.** Усё лета перад хатай Чарнушкаў ціха грэлася на сонцы маладзенькая, з тонкім, як дубец, камлём рабіна. Ніхто ў Куранях, бадай, не заўважыў, калі і хто пасадзіў яе, не бачылі як трэба яе і тады, калі яна красавіцкай раніцай апранулася ў лёгкае празрыста-зялёнае плацце з кволых, рэзных лісточкаў. Дні за днямі цікаўна, але нясмела глядзела яна на вуліцу, на ўсіх, хто праходзіў міма, – сціплая, непрыкметная, за нязграбным плотам, блізка ад вялікіх дрэў. Ніхто не даваў ёй ніякай увагі, мылі яе, песцілі толькі цёплыя дажджы, ды любілі шумець маладым лісцем вятры. Людзі ж яе як бы не заўважалі, спачатку таму, што проста не прыкмецілі, а потым таму, што непрыкметна прывыклі.

**II.** І неспадзявана адбылося незвычайнае: ціхая, нявідная, у жнівеньскім росквіце рабіна заружавела, зазырчэла яркім, кідкім хараством, гарачым полымем агністых гронак. І не адны вочы, не абыякавыя, не ачарсцвелыя ў жыццёвых пакутах да хараства, глядзелі здзіўлена, зачаравана: “Глядзі ты!.. ”

**III.** Як тая рабіна, цвіла ў гэтае лета Ганна. Яшчэ, здаецца, учора была гарэза, падлетак, а вось ужо, глядзіце – у самай добрай пары дзяўчына, у самай красе сваёй! Калі толькі вырасла!

**IV.** Глядзелі на Ганну, разважалі і – за малым выключэннем прыдзір з жанок – згаджаліся: выспела, нявеста, нічога не скажаш! Часам пры гэтых гаворках – асабліва жанкі – успаміналі Ганніну маці-нябожчыцу, казалі, што дачка ва ўсім выйшла ў матку. З аблічча – дык як вылітая: і невялікая ростам, і не гладкая – худая, можна сказаць, і плечы, як у маткі, вузкія, і рукі тонкія. І косы чорныя, густыя, аж blішчаць, бы намочаныя, і смуглявасць на твары такая ж, і шчочкі таксама ж выпінаюцца.

**V.** Іншы раз языкі жанок – прыдзір ці зайздросніц – меркавалі, што грудзі ў Ганны малаватыя, як кулачкі: чым толькі дзіця карміць будзе, калі давядзецца? Але пры ўсім тым – нават прыдзіры і зайздросніцы не пярэчылі – Ганну ніяк нельга было палічыць за кволую: збоку, з аднаго позірку відаць было – крамяная ў Цімоха дзяўчына, дужая, сілаю ўся налілася! Вунь якая пругкая ў хадзе, спрытная якая ў рухах, так і відаць – маладосць, сіла ў кожнай жылачцы!

**VI.** Той, каму быў час і ахвота прыглядацца, хто лепш бачыў Ганну, заўважаў, што перамянілася яна не толькі з аблічча. Багата што інакшае было і ў тым, як яна хадзіла між людзей, – стрымана і паважней, як трымалася з хлопцамі, – стражэй і з нейкай кплівасцю. Нават смяялася цяпер яна інакш, як дасюль, – смех быў ужо не бесклапотны, не пусты па-дзіцячы, у ім таксама звычайна чулася кплівасць; і штосьці як бы таілася ў гэтым смеху. І глядзела яна інакш, – нядаўна адно дзікавата-цікаўнымі вачыма. Як і раней, не было, здавалася, такой хвіліны, каб вочы яе, вільготна-цёмныя, падобныя на спелыя вішні, былі абыякавыя, нудлівыя, увесь час блішчэла, ззяла ў іх няўціхнае хваляванне. Але сачылі яны з-пад шаўкавіста-чорных смелых броваў цяпер з падсцярожлівай, пільнай уважнасцю і, здавалася, толькі і чакалі выпадку кпліва падсмяяцца. Іншы раз маглі яны, як і раней, бліснуць весялосцю, але часта, вельмі часта гарэлі ў іх недавер’е і насмешка. У іх таксама ж нешта таілася, у цудоўных вішнёва-чорных вачах.

(І. Мележ. Людзі на балоце)

***Заданні да тэксту** (30 балаў)*

| | Балы I | II | III |
|---|---|---|---|
| **1.** Тэкст умоўна можна падзяліць на дзве тэматычныя часткі. Вызначце галоўны вобраз кожнай з частак.<br>Галоўны вобраз першай часткі – ____________<br>Галоўны вобраз другой часткі – ____________<br>*(1 бал)* | ___ | ___ | ___ |
| **2.** З якой мэтай аўтар такім чынам будуе тэкст?<br>____________<br>____________<br>____________<br>*(2 балы)* | ___ | ___ | ___ |
| **3.** Як называецца такі кампазіцыйны прыём?<br>____________<br>*(1 бал)* | ___ | ___ | ___ |
| **4.** З І-га абзаца выпішыце па два прыклады эпітэтаў і метафар, з дапамогай якіх ствараецца вобраз рабіны.<br>Эпітэты: ____________<br>Метафары: ____________<br>____________<br>*(2 балы)* | ___ | ___ | ___ |
| **5.** З IV–V абзацаў выпішыце два прыклады параўнанняў, з дапамогай якіх ствараецца партрэт Ганны.<br>____________<br>____________<br>*(1 бал)* | ___ | ___ | ___ |
| **6.** У мастацкім творы індывідуальнае раскрываецца праз мову, учынак, партрэт. Які спосаб стварэння вобраза Ганны выкарыстоўвае аўтар у дадзеным урыўку?<br>____________<br>*(0,5 бала)* | ___ | ___ | ___ |
| **7.** З VI-га абзаца выпішыце 4 мастацкія дэталі (словы, словазлучэнні) пры дапамозе якіх аўтар паказвае перамены ў характары Ганны.<br>____________<br>____________<br>____________<br>*(2 балы)* | ___ | ___ | ___ |

| Сума балаў за заданні 1–7 *(макс. 9,5 балаў )* | | | |
|---|---|---|---|

*Балы*

*I II III*

**8.** Аднавіце тэкст, устаўляючы неабходныя словы.

Ганна – дзяўчына вельмі _____________ знешне, жыццядзейсная, дзёрзкая, няўрымслівая _____________, якая нясе ў сабе, нягледзячы на цяжкія ўмовы жыцця, душэўную і маральную _____________, з'яўляецца сапраўды "найпрыгажэйшай _____________ Палесся", здольнай глыбока кахаць і _____________ .

**Словы для даведак**:

*кветкай, натура, пакутаваць, прыгожая, прыгажосць.*

*(2,5 балы)*

**9.** Пра каго ў "Палескай хроніцы" І. Мележа гаворыцца:

а) "Задзіра, ганарліўка, бацькава дачка", "кплівая і нядобрая", "крамяная дзяўчына", "пругкая ў хадзе, спрытная ў рухах", "з вільготна-цёмнымі, як спелыя вішні, вачыма, з шаўкавіста-чорнымі смелымі брывамі"?

_____________________________________________

б) "Мужчына, гаспадар, старшы ў сям'і", "з выгляду быў падлетак, худы, даўгарукі, з тонкай шыяй, па хадзе, па прыгорбленай постаці – мужчына"?

_____________________________________________

в) "…відны хлопец, з норавам, паважалі і пабойваліся яго – мала хто адважваўся пярэчыць"?

_____________________________________________

г) "Пляцецца, як бы ледзьве кеўляе. Дзьмухне вецер – і, здаецца, паляціць, як пясчынка тая, рассыплецца, бы трухля… Яна глядзела ўслед, ... дзівілася: ведала, пэўна, ветру такога ў свеце няма, які мог бы не тое, што сарваць з зямлі яго, хоць бы з ног збіць!.."?

_____________________________________________

*(4 балы)*

**10.** З IV-га абзаца выпішыце устойлівае словазлучэнне і растлумачце яго значэнне.

_____________________________________________

*(1 бал)*

**11.** Да пададзеных ніжэй слоў падбярыце па аднаму сіноніму:

кволых – _____________________________________________

песцілі – _____________________________________________

нязграбным – _____________________________________________

гарэза – _____________________________________________

*(4 балы)*

| Сума балаў за заданні 8–11 *(макс. 11,5 балаў )* | | | |
|---|---|---|---|

**12.** З пералічаных ніжэй моў адзначце славянскія:

а) балгарская;
б) нямецкая;
в) літоўская;
г) беларуская;
д) польская;
е) іспанская;
ж) украінская.

*(2 балы)*

| *Балы* | | |
|---|---|---|
| *I* | *II* | *III* |

**13.** З VI-га абзаца выпішыце 4 прыклады ўласнабеларускай лексікі.

__________________________________________________________

__________________________________________________________

*(2 балы)*

| Сума балаў за заданні 12–13 *(макс. 4 балы )* | | | |
|---|---|---|---|

**Прачытайце тэкст пра І. Мележа і адкажыце на пытанні.**

...Ён быў надзвычай сціплым чалавекам. Нават – сарамлівым. Умеў і любіў выслухаць суразмоўцу, не перапыняў яго нават тады, калі той зусім не меў рацыі; зрабіць жа заўвагу ці то не жадаў, ці то таксама саромеўся... Сам жа Іван Паўлавіч гаварыў спакойна, стрымана, разважліва, нібы ўзважваючы кожнае слова, кожную сваю думку. І гэта было зразумела: ён ведаў сапраўдную цану слова...

А вочы! Якія прыгожыя і разумныя былі ў Івана Паўлавіча вочы... У іх чыталася народная мудрасць і памяркоўнасць, спагада і самая вялікая чалавечая дабрыня!

(*Анатоль Мяснікоў)*

**14.** Якія рысы характару, на думку А. Мяснікова, былі галоўнымі ў І. Мележа?

__________________________________________________________

__________________________________________________________

*(1 бал)*

| *Балы* | | |
|---|---|---|
| *I* | *II* | *III* |

**15.** Як аўтар урыўка характарызуе манеру пісьменніка гаварыць? *Адкажыце словамі тэксту.*

__________________________________________________________

__________________________________________________________

*(1 бал)*

| Сума балаў за заданні 14–15 *(макс. 2 балы )* | | | |
|---|---|---|---|

*Балы*
*I II III*

**16.** Чым, на думку А. Мяснікова, тлумачыцца такая манера гаварыць?

______________________________________________

*(1 бал)*

**17.** Чаму вочы І. Мележа аўтар урыўка называе *разумнымі*? *Адкажыце словамі тэксту.*

______________________________________________

______________________________________________

*(1 бал)*

**18.** Выпішыце з урыўка прыклад *градацыі*. (Градацыя (*узмацненне)* – калі групуюцца словы ці выразы з нарастаннем або, наадварот, аслабленнем іх эмацыянальна-сэнсавай выразнасці)

______________________________________________

*(1 бал)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| Сума балаў за заданні 16–18 *(макс. 3 балы)* | | | |

## Чарнавік

АЦЭНКА ВЫКАНАННЯ ТЭСТА

| | | Члены камісіі | | |
|---|---|---|---|---|
| | Макс. сума | 1 | 2 | 3 |
| Сума балаў за заданні 1–7 | 9,5 | | | |
| Сума балаў за заданні 8–11 | 11,5 | | | |
| Сума балаў за заданні 12–13 | 4 | | | |
| Сума балаў за заданні 14–15 | 2 | | | |
| Сума балаў за заданні 16–18 | 3 | | | |
| Сума балаў | 30 | | | |
| Акругленая сума балаў | 30 | | | |

## III egzamino dalis

# TEKSTO KŪRIMAS

З прапанаваных тэм сачыненняў і тэкстаў для інтэрпрэтацыі Вы павінны выбраць адну тэму альбо адзін тэкст і напісаць працу. Праца павінна быць аб'ёмам прыблізна 2 старонкі фармата А4 (250–400 слоў). У чыставіку ад пачатку працы адлічыце 250 слоў, пазначце месца, дзе яны заканчваюцца, і запішыце гэтую колькасць на палях.

## ТЭМЫ САЧЫНЕННЯЎ

1. Гэты твор Янкі Купалы я б параіла (-іў) прачытаць кожнаму…

2. "Паэзія – помнік, у якім увасоблены лепшыя і найбольш шчаслівыя імгненні самых лепшых і найшчаслівейшых розумаў" (П. Шэлі).

3. Каханне як вечная каштоўнасць (па творах беларускай літаратуры).

## ТЭКСТЫ ДЛЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

## 4. М. Багдановіч

## Музыка

Жыў на свеце музыка. Многа хадзіў ён па зямлі ды ўсё граў на скрыпцы. І плакала ў яго руках скрыпка і такая была ў яго гранні нуда, што аж за сэрца хапала...

Плача скрыпка, льюць людзі слёзы, а музыка стаіць і выводзіць яшчэ жаласней, яшчэ нудней. І балела сэрца, і падступалі к вачам слёзы: так і ўдарыўся б груддзю аб зямлю ды ўсё слухаў бы музыку, усё плакаў бы па сваёй долі...

А бывала яшчэ й так, што музыка быццам вырастаў у вачах людзей і тады граў моцна, гучна: гудзяць струны, дзваніць рымка, бас, як гром, гудзіць і грозна будзіць ад сну і завець ён народ. І людзі падымалі апушчаныя голавы, і гневам вялікім блішчалі іх вочы.

Тады бляднелі і трасліся, як у ліхаманцы, і хаваліся ад страху, як тыя гадзюкі, усе крыўдзіцелі народу. Многа іх хацела купіць у музыкі скрыпку яго, але ён не прадаў яе нікому. І хадзіў ён далей меж бедным людам і граннем сваім будзіў ад цяжкага сну.

Але прыйшоў час, і музыкі не стала: злыя і сільныя людзі кінулі яго ў турму, і там скончылася жыццё яго... І тыя, што загубілі музыку, узялі яго скрыпку і пачалі самі граць на ёй народу.

Толькі іхняе гранне нічога людзям не сказала. "Добра граеце, – гаварылі ім, – ды ўсё не тое!" І ніхто не мог растлумачыць, чаму ад грання музыкі так моцна білася сэрца бедакоў. Ніхто не ведаў, што музыка ўсю душу сваю клаў у ігру. Душа яго знала ўсё тое гора, што бачыў ён па людзях; гэта гора грала на

скрыпцы, гэта яно вадзіла смыкам па струнах; і ніводзін сыты не мог так граць, як грала народнае гора.

Прайшло шмат гадоў з таго часу. Скрыпка разбілася. Але памяць аб музыку не згінула з ім разам. І з-памеж таго народу, катораму ён калісь граў, выйдуць дзесяткі новых музыкаў і граннем сваім будуць будзіць людзей к свету, праўдзе, брацтву і свабодзе...

1907

## 5. А. Вярцінскі

**Чалавек маленькага роста...**

Чалавек маленькага роста,
чаму не рос, па чыёй віне?"
Чалавек адказвае проста:
"Гэта залежыць не ад мяне".
"Чалавек маленькага розума,
мог ты быць разумнейшым ці не? "
Чалавек гаворыць цвяроза:
"Гэта залежыць не ад мяне".
"Чалавек душы маленькай,
Мог ты лепшым быць ці не?"
Чалавек маўклівы нейкі,
не адказвае ён мне.
Мабыць, цяжкае пытанне.
Чалавек маўчыць нездарма.
Хібам нашым ёсць апраўданне,
подласці апраўдання няма.

ЧАРНАВІК

*Працяг чарнавіка на 12-й старонцы*

# ЧЫСТАВІК

*I* *II* *III*

***Працяг чыставіка на 13-й старонцы***

*Працяг чарнавіка*

*Працяг чарнавіка на 14-й старонцы*

***Працяг чыставіка***

*I* *II* *III*

***Працяг чыставіка на 15-й старонцы***

*Працяг чарнавіка*

***Працяг чыставіка***

*I* *II* *III*

| III dalis (teksto kūrimas) | | | | Сума балаў |
|---|---|---|---|---|
| **Змест** | **Структура тэксту** | **Стыль мовы** | **Грамат-насць** | |
| 20 балаў | 4 балы | 4 балы | 12 балаў | 40 балаў |
| | | | | |